БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Рэдакцыі Ново-Сэрпухуская 29
Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

...кцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
...ністрацыя—эр:на ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

...кцыя пакідае за сабой права па...ляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рубл.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб. на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 85. Менск. Аўторак 9 ліпня 1918 г. Год I

Менск 9/VII.

Большэвікі і коаліцыя.

...раду Ленін-Троцкі-Чычэрын ...ецца усе меньшая і меньшая тэрыторыя. ...онтр-рэвалюцыя, у якой ...ьце прыймаюць па...рожнейшыя элемэнты, пачына... ад с.-р. (соц.-рэв.) і кан...чы с. р. н. (союз русск. ...ода) паволі захапляе усе ...ыя і большыя абшары, ...увае сваю ваенную лінію бліжэй да цэнтру «соцы...тычнай рэспублікі» і ро... карацейшымі радзіусы пра...ынпасьці совнаркомскіх дэк...ау. Рух гэты ні можа наз...ца на праудзі народным, бо ...од у яго ніжэйшых вэр...ах у Расіі можа быць, най...ьш што, прыцягнут да па...ыканства, а ні уцягнуты у ...ітыку. Народ, каторага глау... культурнай і палітычнай ...адай быу зоологічны прып... «есьці!», што пакрывалося ...атрабаваннем «вся земля—...оду!», доуга іщчэ ні будзе ...ць учасьця у палітыцэ, па...ь ні павучыцца знаць што ...а такое.

...Цудоуным спосабам пазбау...ы вобраці, якую накладау ... яго самаууладны парадак, ...стыхійна пайшоу за боль...вікамі, што ласкава аддава...яму, зараз-жа, усю зямлю і ...ер запомніушы усе ад ні...дзеванаго шчасьця, будзе, ...зямны рабак, пэратрауляць ...у зямлю, пакуль ні здаво...ца. А здаволенне наступіць ... так скора.

...Аднак гэта, што контр рэ...люцыйны рух ідзець над па...дам, надае яму хіба яшчэ ...ьш натугі. Ды і сам па ...бе ен уключае вялікія сілы. Проці большэвікоу выступа...ць гарады і усе што з імі ...вязапо. Ні можна казаць, ...го выступаюць буржуазныя ...ы толькі. У проці большэ...цкіх шарэнгах ідзець усе, ...го разумее патрэбу дзержау...го ладу, грамадзкога спакою ... чалавечай культуры. Поруч ... буржуазіяй ідзець і дэмок...тыя: работнікі у разбуранай ...рамысловасьці і у стаптанай ...гамі культуры—інтылігэнцыя.

Калі узяць пад увагу, што і большэвікі рэкруруюць свае сілы толькі з меськай дэмократыі і у цяперашні момэнт толькі на іх могуць апірацца, то зробіцца ясным на чый бок у канцы павінны будуць схіліцца шалькі.

Пераможа «контр-рэволюцыя». Але якія сілы заступяць большэвікоу—гэто німа ведама. Легка дапусьцімо, што на мейсцо прэзэса «с'ѣзда совѣтов» Леніна сядзе ні прэзэс «Учредительнаго Собранія» В. Чэрнов, але нехто іншы, пасаджэны той партыяй, якая цяпер як сьцяг уселюдна паказуе Міхаіла Александровіча. Тым лягчэй можа гэто стацца, што коаліцыя, з якой зьвязалася цяпер «контр-рэволюцыя» саусім ні любіць «цыммэрвальдца» Чэрнова, яго збанкрутаваушай у часе рэвалюцыі партыі і яе спагадачоу.

Адпак справа упутранаго ладу у Расіі—справа будучаго часу, а пакуль што дзержавы згоды, хочучы мець усходня-нямецкі фронт, абецаюць толькі свае падтрыманне «Расіі» і прырэкаюць ні умешывацца у яе упутраныя справы, насколькі гэто ні датыча большэвікоу. З большэвікамі-ж іншая рэч. Апрача падмогі—падаванай проці большэвіцкім элемэнтам, творыцца ангельскімі сіламі праудзівая ваенная прыгроза на Мурмапе, уладаючы якой коаліцыя ужо мяркуецца прэдставіць большэвікам ультыматум, аб стасунках Расіі з сабой.

Апошні абурэваючы чын коаліцыі, забіуство за помаччу сваіх агентау у Маскве прэдстауніка Нямецкай Імпэрыі, вінпаго толькі у прыхільнасьці да Расіі і суменным выпоуненні абавязкау, што да свайго народу, паказуе што коаліцыя здолала раскінуць сеці свайі інтрыгі надта шырока і савецкаму «совнаркому» пагражае праудзівае нібезпечэнство.

—і.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН 6 гм. (Урадова). Сягоння каля поудня двое паноў папрасілі аудіэнцыі у імпэрскаго пасла у Маскве, каторую граф Мірбах і даў ім у прысутнасьці райца Рытслера і нямецкаго ахвіцэра. Абодва пізнаёмцы выцягнуўшы рэвальвэры і выстрэлілі у пасла і лёгка ранілі яго у галаву.

Карыстуючы момэнтам, яны усьлед за гэтым кінулі дзьве ручных грапаты і уцяклі выскачыўшы праз вакно. Граф Мірбах, цяжка ранены, ускорасьці памер. Абедзьве асыставаўшыя асобы асталіся нізачэпленнымі.

Комісары заграгічных спрабаў Чычэрып і Каран, атрымаўшы весьці аб гэтым зладзействі зараз-жа прыбылі у пасольство і ад імені савецкаго ураду выказалі абурэнне і пашкадаванпе с прычыны патрасаючаго выпадку. Паўзятае зараз жа сьледзтво дае праможнасьць дапушчаць, што напад зроблены агентамі напятымі коаліцыяй.

ВЕНА 5 гм. «Вольф». У Бэрліне 4 гм. прэдстаўнікі Аўстро-Вэнгрыі і савецкай рэспублікі абмепяліся ратыфікацыямі мірнаго дагавору паміж гэтымі дзержавамі. Абмен зрабілі: Аўстро-Вэнгерскі дыплёматычны агент у Бэрліне Лярыш і тутэйшы прэдстаўнік савецк. ураду Іоффе.

РЫМ 5 гм. «Вольф». Памер кардынал Мартінэлі.

ЛУГАНО 5 гм. Прыбыўшы сюды Румынскі экс-прэмьер Таке Іонэску у гутарцы с супрацоўнікам газ. «Sekolo» сказаў, што нафтавыя промыслы зноў даведзены немцамі да парадку. Цяпер там дабываецца значная колькасьць нафты; у ваколіцах прамыслаў відаць соткі грузавых паравоаў і барак з надпісам «нямецкае моралодство». Сягоняшні ураджай у Румыніі дзеля сушы павінен быць копскім, за тое добрых ураджаяў трэба спадзевацца у Вэнгрыі і Аўстрыі.

БЭРН, 4 гм. Касацыйным судом у Атэнах узята пад увагу касацыйная скарга грэцкіх ахвіцэраў, каторыя вярнуліся з Згорэльцу, прысуджаных ваенным судом да кары сьмерцю.

ШТОКГОЛЬМ, 4 гм. Подлуг ходзячых тут чутак, ангельскі прэдстаўнік у Расіі Локарт, атрымаў нібы загад з Лёндану падаць маскоўскаму ураду ад імені чацьвернай згоды коратка-тэрміновы ультыматум а становішчу Расіі да коаліцыі.

ВЕНА, 3 гм. «Вольф». Прэзыдэнты абоіх палат робяць астатнія прыгатавання перад аткрыццем парлямэнту, якое наступіць 16 ліпня. Перад гэтым зьбярэцца сэньэрэн-конвэнт для устанаўлення дзеннаго парадку, якога першым пунктам будзе чытанне праэкту бюджэту на поўгода 1918 г.

Палата паноў зьбярэцца так сама 16 ліпня і, здаецца, будзе мець толькі адно пасядзэнне.

Пасольскія мандаты канчаюцца 31 сьнежня 1918 году. Здаецца, што у працягу лета іщчэ яны будуць прадоўжаны.

ГААГА. Каралева прыняла да сведзення прашэнне габінэту аб адстаўцы і даручыла міністрам часова прадаўжаць вядзенне бягучых спраў.

БЭРН. Як вядома, конфэрэнцыя належачых вайной абавязковасьці у Дубіне, зложаная з нацыяналістаў, сінфэйнэраў і прыхільнікаў рабочай партыі, адправіла колькі часу таму назад пасланне да Вільсона, у каторым яго просяць пасрэднічаць у Лёндані па карысьць Ірляндзіі. Бургамістру Дубліна, каторы павінен быў адправіць пасланне Вільсону, са стараны міністэрства міжнародных спраў выдача паспарта была зроблена залежачым за умовай, каб гэто пасланпне было раней паказано лёрд - лейтэнанту Фрэнчу. Пасьля гэтаго бургомістр перадаў яе амэрыканскаму паслу для адпраўкі. У сапраўдзіцельным лісьце, згодна «Таймс», адзначаецца, што апошняя умова ні апраўдываецца ніякімі законнымі пастановамі. Пасланне будзе публікавано у Ірляндзіі 4 ліпня, калі яно дайдзе да Вашынгтона.

Новы султан. Турэцкі трон заняў брат памёршаго Магамэта V, князь Ваід Эддзін.

Ваід Эддзін радзіўся у Констаптынополю у 1861 годзе. Жыў па большай часьці у Скутары.

Весткі з Расіі.

— КОПЭНГАГА, 4/VII. Большэвіцкі пасланнік у Хрыстыані, Бэйтлер, як паведамляе «Бэрлінске Тыдэндэ», у панядзелак выехау праз Вардэ у Расію. У Кіркінеса параход затрымауся ангельскім руйнуючым караблем. Бэйтлер і трое другіх расійцау былі пераведзяны на ангельскі карабель, каторы высадзіу іх у Пѣчэнезі, дзе яны і былі інтэрніраваны. Бэйтлер меуся ехаць у Маскву дзеля парады з Леніным.

— МАСКВА. Старшыня расійска-украінскай мірнай дэлегацыі, Ракоускі, прыбыу у Маскву. Па яго славах мір з Украінай будзе падпісан у працяг двух тыдняу.

ШТОКГОЛЬМ, 4/VII. Па вестках газ. «Свенска Дагбладэт», японскі пасол у Маскве павядаміў савецкаму ураду, што высадка японскіх войск у Владывастоку мае толькі мэтай абарону інтарэсаў хаўрусьпікаў на Далёкім Усходзі, падобна мерапрыяцям ангельцаў на Мурмані. Мера дзействіі гэтых войск залежыць ад таго, які абарот прымуць адносіны паміж хаўрусьнікамі і савецкім урадам.

ШТОКГОЛЬМ. «Правда» цытуе з органа чэшскіх камуністаў «Прукопнік Свабоды» вось якія разоблачэнні: Французкі урад адпусьціў для контр-рэвалюцыйнаго выступлення чэхо-словакаў і белай гвардзіі сумму у 11 мільёнаў рублёў. Ангельслі урад даў 3.600.000 руб. Даказацельствы гэтаго пацьвярджэння папалі у рукі камуністаў у часе распуску чэшскай нацыянальнай рады у Маскве. Да свайго контр-рэвалюцыйнаго выступлення салдаты чэшскіх легіонаў атрымалі месячную пэнсію у 5 руб. Ад дня пачатку контр-рэвалюцыі гэта пэнсія была павялічэна да 200 рублёў. Гэты подкуп компрамэнтуе так-сама імя чэшскаго прафэ-

саро Массарыка. Даказана, што ад'езд Массарыка у Францыю мае некаторую зьвязь з выплатай вялікай суммы чэшскай нацыянальнай радзе. Сярод чэха-словакаў знаходзяцца так-сама два французкія ахвіцэры—генэрал Лавэрг і майор Вэржэ.

МАСКВА. Архангельская губэрня апавешчана на ваенным становішчы.

ВАШЫНГТОН. Знаходзячыйся цяпер у Валогдзе амэрыканскі пасол Фрэнсіс паведамляе, што большэвікі арэштавалі членаў Архангэльскаго правінцыяльнаго ураду. Так сама членам меськай думы у Валогдзе пагражалі арэштам.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Кортоплі 4000 пуд. будзе у хуткім часе дастаулена нямецкім граданачальствам дзеля патрэб места з Маладэчна.

Мэдыцынскія мерапрыяцці на адбыушымся у Ігумені лекарна-санітарным савеці павета было рэшано дзеля болей пасьпешнай барацьбы с эпідэміяй зараз жа уладзіць 10 баракау—шпіталяу на 10 чалавел кажны, якія будуць абслужывацца санітарным пэрсоналам і дзе будуць уладжэны дэзынфэкцыйныя апараты. Апрача таго пастаноулена мець адзін лятучы санітарны дэзынфэкцыйны атрад.

Ліквідацыя. Пачата ліквідацыя грамадзянскаго аддзелу меськай управы, каторы пры старой думе грау роль начальственнай інстанцыі. Цяпер з мэт эканоміі гэты аддзел касуецца.

Тое самае будзе і з аддзеламі — працы, памешканняу, статыстычным і сэкрэтарыяту. У лепшым выпадку там будуць зьменьшаны штаты.

Мясо учора, 8 ліпня і сягоння 9 ліпня, выдаецца ва усіх мясных крамах па бонах — звычайнае $2^1/_2$рб. за фунт і кашэрнае—2 р. 70 к.

Курсы для народных вучыцелеу у Бабруйску. У Бабруйску адчынены пэдагогічныя курсы для народных вучыцелеу Адкрыло іх «Общество содѣйствія внѣшкольному образованію», каторае істнуе каля трох месяцау ні маючы грошай. Грошы дасталі. Тысячу рублеу дало павятовае земство, а тысячу пяцьсот—губэрнскае. Прыехалі на курсы, прауда німногія, склад слухачоу—каля сарака вучыцялеу с павету і каля трыццаці чалавек, каторыя рыхтуюцца к вучыцельству і жывуць у месьці.

Земскія стыпэндыі. У аддзеле народнай асьветы губ. земскай управы пачауся прыем заявау ад георгіеускіх кавалерау або іх дзяцей на права адтрымання 5 стыпэндый па 600 руб. кожная, пацьвержана 7-м чарговым земскім сабраннем.

Вучыцельскія курсы. Беларускім Народным Сэкрэтарыятам адчыняюцца у Менску ад 1-го жніуня вучыцельскія курсы. Адпушчаны для гэтаго патрэбны крэдыт.

Да прыему дэпазытау. Каб ні мелі страты установы пры здачы грошай на храненне с прычын хілення курса, глаунокамандуючы X армій паставіу, каб пры прыеме адкрытых дэпозытау сумма была вызначэна у марках.

Аб уплаце падатнау, нідаімак і г. д. глаунокамандуючым X арміяй, дзеля ахраны краевых касс ад мажлівасьці страты на курсе, прыказано, каб гэткія уплачываліся і прыніміліся толькі у курсавых грошах: да 10-го ліпня 1 налогавы руб.—1 ост—рублю, такім чынам:

а) Жыхаром Менску ад 20 ліпня:

б) жыхаром м. Бабруйску, Слуцку, Ігумену, Барысава і Магілева ад 25 ліпня.

в) Жыхаром Менскаго, Слуцкаго, Бабруйскаго, Рогачоускаго, Магілеускаго, Ігуменскаго і Барысаускаго павету ад 5-го жніуня.

Праверка бонавых кніжак ва усіх 5-ці бонавых бюро павінны закончыцца 11-го ліпня.

12-го ліпня пойдзе праверка кніжак, якіх бонавыя бюро ні пасьпелі зарэгістроваць своечасна.

Хлеб ад учарашняго дня пачалі выдаваць па запасным бонам па $1^1/_4$ фунта на порцыю на першую палову тыдня.

У земстве. Агульная пераацэнка рэчэй аблажэння, пачатая яшчэ старым цэнзавым менскім земствам, так і ні была даведзена да канца. Дваранска-памешчычы элемэнт, кіруючы усей земскай работай, наумысьне тармозіу усю справу, баючыся агульнай перааацэнкі, баючыся, што многія кустарнікі, каторымі уладалі на паперы памешчыкі, акажуцца векавымі лесамі у Ігуменскім, Барысаускім і другіх паветах, што бездаходныя пустыры акажуцца жытнімі альбо пшанічнымі палямі 1 разраду і г. д. Гэта было ім ні на руку—і мы стаім перад ніспрэчным фактам: зрабіць агульны перагляд абьектау аблажэння.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоуна[га] камандавання за 7 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

На фронці паміж Ізэрам і Марнай часамі ажыўляла[сь] баевая дзеяльнасьць. Заходней Шато—Тьеэры французы [і] амэрыканцы зноў павялі атакі з новымі сіламі, ні гледзю[чы] на піаднакратныя ніудачы. Атакі адбіты. Упартыя стыч[кі] прадаўжаліся да ночы. Варожыя страты, згодна вестка[м] вельмі вялікія.

У верхніх Вогезах былі адбіты варожыя атакі ка[ля] Гільзэнфірста.

Лейтэнант Кролль меў сваю 30, летэнат Кэппеке св[аю] 21 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Весткі с краю.

М. Койданоу. Менской губ.

На Сёмуху у м. Койданова, адбыўся беларускі спэктакль. Гралі тры маленькіх рэчы: «Сватанне,» «Мядзьведзь» і «Як яны жаніліся». Апрача гэтаго выступаў аркестр балалаечнікаў.

Маленькая саля пажарнаго гуртка, бадай ці відзела калі у сваіх сьценах болей народу. Тут былі усе: і селяне, і жыды, і мейсцовая інтэлігэнцыя, паміж імі усімі было шмат і немцаў. На усіх тварах адзначалася урочыстасьць, якой веяло і ад самой салі. Трэба аддаць справедлівасьць, што гаспадар вечару п. Бурвель улажыў многа працы дзеля гэтаго. Ад увойсьця у салю кідаліся у вочы нацыянальныя флагі задраміраваныя кветкамі і вянкамі з зеляні. Ды бадай што палова з гасьцей на вечарынцы мела у пятліцах нацыянальныя беларускія значкі. Відаць адразу, што нацыянальное пачуцце у Койданаўскіх жыхароў даўно абудзілося [...] яны, ні шкадуючы пр[а]цы, стараюцца яго шыры[ць] і разьвіваць у сваіх суседз[яў]. Ні буду вельмі многа гав[а]рыць аб выпаўненні сам[іх] пьесаў, бо тое, што рабіло[ся] праз. ідэю заўседы будзе добр[а]. Але тут я скажу, што ігра б[ы]ла вышэй пахвалы, бо як [я] ні стараўся улавіць якую ко[ль]век абмылку (рэчы гэтыя [я] добра знау) але ні удало[ся]. Адразу было відаць, што [ар]тысты шмат папрацавалі. [І] гэта і публіка дружна і м[ы] на вітала іх, выклікаючы некалькі разоў. Я вельмі б[ыў] зьдзіулены тым, што нем[цы] быўшыя у тэатры, віталі ар[ты]стаў болей за усіх. Як пот[ым] я дазнаўся, нікаторыя з [іх] знаюць беларускую мову.

Завеса зачынілася, але [у] салі ішчэ доўга быў друж[ны] рогат, спаміналіся, мус[ібыць] сьмешныя мейсцы у пьеск[ах]. Пад канец вечары ствар[ы]ся нават і анэкдот. Граў [...] балалаечнікаў. Народу вел[ьмі] спадабалася так званая «Б[е]ларуская полька» і пот[ым] «Лявоніха» за гэтаж і ар[ты]стам яны даліся у знакі: [...] прышлося іграць і іграць. [...] самым канцы праграмы ра[з] з словам «біс» ішчэ маці [...] было чуваць «Лявоніху, Ляв[о]ніху»... Дырыжцо узмахв[ы] рукамі і пачаўся марш, [...] што нейкі балагур па ув[аход] рот закрычаў словы адной [з] пьес: «Зацягнулі замест [...] хто там ідзе» «Ці ні ду[маў,] мая!»

На агульныя скокі зас[та]лося многа народу. Лявоні[ха] была як гаворапь расій[цы] «гвоздем вечера», бо нар[од,] асабліва немцы, так скака[лі,] што пажарныя гаварылі, [што] пададуць «іск» за падлогу.

Канчаючы, пажадаю, к[аб] добры прыклад Койданоўск[ай] беларускай інтэлігэнцыі, ва[...] шоў у патрэбу усіх кутк[оў] нашай Бацькаўшчыны. А Ко[й]данаўцам шчыра дзякую [за] артыстычную прыемнасьць, як[ую] вынясл я і ўсе з вечара.

Падарожны.

На рэках Вавілону.

(успамінкі уцекача)

X*).

Ні у шумнай бяседзе сябры пазнаюцца,—
Сябры пазнаюцца у ніузгодзе.
(З расійскаго).

Час бег і паміпутна прыносіў да нас усё новыя і новыя весткі і гледзячы на тое, якія яны былі, то смутней, то весялей рабілося у усіх беларусаў на душы. Пачалі скора данасіцца праз газэты ніясныя чуткі аб тым, што узнова ідуць пірамовы між Расіяй і Нямеччынай аб згодзе. Скора гэтыя весткі сталі шчырай праўдай і у ўсіх зрадзілася надзея на тое, што па астанку удасца чагось дачакацца. Цяпер ужо падта мала каго, з закіненых у гэты далекі край нашых селян, цікавіла справа аб тым ў чыю карысьць скончыцца ўсё гэта страшэннае змаганне. Праўда, і без таго было ясна, што Расія мусіць згадзіцца на ўсе варункі, якія будуць дадзяны Нямеччынай, але і гэта мала каго цікавіла.

Змучаных голадам і холадам на чужыне, іх мала абходзіла справа як Нямеччыны так і Расіі. Найбольш, што цікавіла іх,—гэта пытанне ці скора будзе можна паехаць да сваіх хат, ў родную старонку, дзе—як гаворэ наша старая прыказка—«і куст — маці». Ні «дэмакратычная» Расія, ні сеяныя страхі аб немцах,—ні магло заглушыць ахвоты хутчэй вярнуцца у родны край. Па праўдзе і нібыло чаго жалець нашым селянам у Расіі. Прыехаўшы туды, яны, замест абецанаго братэрскаго ім пароду, спаткалі зусім чужых людзей, каторыя ні толькі ні сьпяшылі прывітаць іх па братэрску, але, наадварот, стараліся паказаць сябе ўсюды лепшымі, разумнейшымі, зухавацейшымі, ад каторых наш народ спатыкау па кожным кроку толькі кпіны з сваёй вопраткі, з сваіх звычаеў і сваей мовы. Асабліва цяжка даставалася нашым людзям за пашу мову. І па праўдзе, яна ніздатна да такой лаянкі як расійская, дзеля чаго мусіць і паказалася расійцам брыдкаю. Адно хто добра у Казані аднасіўся да нашых людзей, то гэта татары.

Змучаныя расійскімі зьдзекамі над усім сабе сьвятым і прывучаныя бараніць і шанаваць усё сваё, яны прыхільна спаткалі нашых братоў. Шчырая ім за гэта належыць падзяка і жаданне як мага хутчэй дачакацца тэй хвіліны, калі ім удасцца скінуць апеку чужынца, і заняць у сьвеце тое мейсцо, якое ім належыць дзеля іх нацыянальнай сьвядомасьці.

XI.

I бачылі тут нашы людзі хто ім брат, а хто—вораг. Ворагамі нашымі найгоршымі і аказаліся Расійцы. Вызваная вайной дарожыня і разруха ставіліся ў віну бежанцам і ні толькі ў кватэрах расійцаў, але і на вуліцах ні раз можна было чуць словы, што як ні было бежанцаў, то ўсё было танна і ўсяго было многа, а як панаехала бежанцаў, то ўсе дзеля гэтаго падаражэло. Ні раз нашым уцекачам прыходзілося дрыжэць за сваё жыццё, бо па гораду пачыналі хадзіць слухі, што маскалі зьбіраюцца выразаць ўсіх бежанцаў. Пакуль быў цар, то прынамсі хоць было на каго скідаць віну. Тагды гаварылі, што абрусіцельную палітыку вядзе цар і яго сьвіта і што гэтая сьвіта і ён шырацъ такія весьці, каб людзі менш ў ўсем вінавацілі вайну. Але хоць скора ністало цара «братское» адношенне да нашых людзей ні палепшалося але рабілося горшым. Скора нашых людзей пачалі ужо сыстэматычна байкатаваць. Рабочыя хаўрысы паволі пачалі націскаць на хвабрыкі, каб тыя ні прынімалі на работу уцекачоў, што хвабрыкі мусілі спаўняць. Акцябрская рэвалюцыя ні палепшыла справы нашых уцекачоў. «Братэрство, вольнасьць і роўнасьць» былі толькі для маскалёў але ні для нашых гаротных людзей, за каторых ні было каму ўступіцца, ні толькі што каб памагчы. Беларускаго камітэту помачы уцекачом ў Казані стварыць ні удалося і нашы людзі, такім парадкам, былі аддадзены ў апеку тых самых расійцаў, каторыя так пад імі зьдзекаваліся. Гэты «дэмакратычны» пераварот ў Расіі і наступіўшае за ім безрабоцце перш-на-перш ударыў нашых людзей, бо іх, перш за каго, пачалі рабочыя саюзы гдзе мага выкідаць з хвабрык і ні дапускаць становіцца на работу. Слаба памагаўшы да таго часу Расійскі камітэт помачы учекачом пачаў, што раз' то болей, абрэзаць сваю і без таго скупую помач. Цяпер ўжо ўсім было відаць, што ні адзін цар любіў зьдзекавацца над нашым народам, а што гэта ён рабіў за згодаю ўсяго Вялікарасійскаго пароду.

В. Грыневіч.

(Далей будзе).

*) Гл. №№ 73, 75, 78 і 81.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня И. А. Грынблята.